# Значэнне слова

## Стымулюючыя заняткі па беларускай мове ў II класе, прымеркаваныя да Міжнароднага дня сям'і

Кожны настаўнік ставіць сваёй мэтай не толькі засваенне вучнямі ведаў па вучэбных прадметах, фарміраванне ў іх умення выкарыстоўваць веды на практыцы, але і выхаванне ў вучняў зацікаўленасці да вучэбнага матэрыялу, дасягненне імі добрых вынікаў у прадметных алімпіядах, развіццё творчых здольнасцей. Рэалізаваць гэтыя задачы настаўніку пачатковых класаў дапамагаюць стымулюючыя заняткі.

**Асаблівасцямі пабудовы сшытка** «Беларуская мова. Сшытак для стымулюючых заняткаў. 2 клас» (Аверсэв, 2013) з'яўляецца магчымасць выбару вучнямі парадку выканання заданняў і дадатковых заданняў да іх. Выходзячы з узроставых асаблівасцей вучняў пачатковых класаў, выклад матэрыялу ў сшытку мае гульнёвы, займальны характар. Калі вучням цікава на вучэбных занятках, у іх з'яўляецца дадатковая матывацыя да больш асэнсаванага, стараннага выканання заданняў, што спрыяе павышэнню матывацыі дасягнення поспеху. Значная колькасць заданняў мае займальны характар і аформлена як гульні са словамі (гульнябблытаніна, галаваломкі, рашэнне прыкладаў незвычайнай матэматыкі, рэбусы і інш.).

У сшытку прысутнічаюць заданні, у якіх вучням прапануецца намаляваць, як яны ўявілі сабе пэўны эпізод тэксту. Зразумела, што для таго, каб гэта зрабіць, неабходна яшчэ раз уважліва прачытаць тэкст задання, скласці ўнутраны план дзеянняў, паспрабаваць творча асэнсаваць твор.

Пасля кожнага задання вучні маюць магчымасць выканаць дадатковае заданне. Большасць з іх патрабуе ўспомніць і прымяніць веды, атрыманыя раней.

Спынімся асобна на заданнях-расфарбоўках, прапанаваных у канцы кожных заняткаў. Гэта зразумелыя вучням сюжэты з жыцця на тэмы сямейнага, працоўнага, экалагічнага выхавання, а таксама малюнкі, якія дазволяць правесці гутарку, накіраваную на павышэнне матывацыі да вучобы, развіццё пачуцця сяброўства, узаемадапамогі, клапатлівых адносін да членаў сям'і і інш.

Заўважым, што ў якасці ўмоўных знакаў, якія дапамогуць выбраць колеры для расфарбоўвання малюнкаў, выкарыстоўваюцца спецыфічныя літары беларускай мовы ***ў***, ***і***, спалучэнне літар ***дж***, ***дз***, надрадковы знак апостраф ***'***. У час выбару колераў для расфарбоўкі вучні маюць магчымасць яшчэ раз замацаваць зрокавыя вобразы літар.

Выкарыстанне розных прыёмаў, накіраваных на развіццё звязнага маўлення вучняў («Складзі апавяданне па ланцужку», «Казка за 3 хвіліны», «Конкурс казачных гісторый», падбор загалоўкаў да апавяданняў і казак, створаных аднакласнікамі і інш.), дазволіць неаднаразова выкарыстаць гэтыя сюжэты.

Змест дапаможніка накіраваны на вырашэнне наступных задач:

- замацаванне моўных ведаў і ўменняў, павышэнне матывацыі да вывучэння беларускай мовы;
- фарміраванне ў вучняў умення планаваць і ацэньваць сваю дзейнасць, рацыянальна выкарыстоўваць час (магчымасць выбару парадку выканання заданняў і ўласнага аб'ёму працы);
- развіццё творчых здольнасцей вучняў;
- выхаванне станоўчых рыс і якасцей асобы вучняў.

**Паслядоўнасць працы.**

1. Згодна з тэмай заняткаў вучань знаёміцца са зместам кожнага задання, выбірае, у якой паслядоўнасці ён будзе іх выконваць. (Гэтае ўменне спатрэбіцца ў будучым у час удзелу ў алімпіядах, выканання іншых конкурсных заданняў з магчымасцю выбару парадку выканання заданняў.)
2. Пасля выканання асноўнага задання ёсць магчымасць выканаць дадатковае заданне і атрымаць яшчэ адзін бал.
3. У канцы тэмы ў табліцу запісваецца нумар задання і колькасць балаў, якую, на думку вучня, ён здолеў атрымаць.
4. Настаўнік дапамагае праверыць правільнасць выканання заданняў.
5. Пад кіраўніцтвам настаўніка па малюнку ў рубрыцы «Незвычайная расфарбоўка» складаецца апавяданне (казка ці інш.), вызначаецца галоўная думка твора.
6. Згодна з умоўнымі абазначэннямі вучань расфарбоўвае сюжэтны малюнак, мае магчымасць дадаць свае колеры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Стымулюючыя заняткі па тэме «Значэнне слова»

Класны пакой упрыгожваецца дзіцячымі малюнкамі на тэму «Мая сям'я», можа быць створана фотавыстава «Святло маёй сям'і». З каляровай паперы выразаюцца далонькі па памеры дзіцячых і дарослых далоняў. На іх пасля выканання кожнага задання калектыўна будуць запісвацца цікавыя сумесныя справы. Па меркаванні настаўніка, на заняткі могуць быць запрошаны бацькі вучняў.

Гучыць лірычная мелодыя. Настаўнік паведамляе, што 15 мая штогод у нашай краіне адзначаецца Міжнародны дзень сям'і, і прапануе правесці незвычайныя стымулюючыя заняткі: не толькі замацаваць веды па тэме «Значэнне слова», але і паразважаць, якія цікавыя сумесныя справы могуць выконваць разам члены кожнай сям'і, усвядоміць важнасць сям'і ў жыцці кожнага чалавека.

У якасці эпіграфа да гэтых заняткаў можна прапанаваць выбраць верш вучаніцы пачатковых класаў Насці Новік з г. Гродна «Мая сям'я»:

Як цёпла дома, светла, утульна...
Зазззяе сонейка ярчэй,
Калі зірне мая матуля,
Як промні — дабрыня вачэй.
А тата зладжана, спакойна
Майструе штосьці вельмі здольна.
Без працы не сядзіць бабуля:
Вось вышываецца кашуля.
Занятак мае і дзядуля...
Мая сям'я мне дорыць шчасце —
Любові, дабрыні багацце.

Вучням прапануецца растлумачыць, як яны разумеюць значэнне слова *сям'я*.

Загадзя ў час падрыхтоўкі да гэтых стымулюючых заняткаў настаўнік разам з вучнямі можа правесці вуснае ці пісьмовае апытанне, падчас якога бацькі вучняў, іншыя настаўнікі выказваюць сваё меркаванне, што для іх значыць слова *сям'я*.

Вучні выразна чытаюць на памяць верш Ніны Галіноўскай «Калі я шчаслівы?». Чытанне верша можа суправаджацца дэманстрацыяй фотаздымкаў ці мультымедыйнай прэзентацыяй.

Клюшка са мной, мячык са мной —
Я рухавы.
Сонца са мной, кветкі са мной —
Я ласкавы.
Мурка са мной, Тузік са мной —
Я смяшлівы.
Мама са мной, тата са мной —
Я шчаслівы.

— Як вы разумееце разважанні хлопчыка? Успомніце і раскажыце, калі вы бываеце ласкавымі, рухавымі, смяшлівымі. Калі вы адчуваеце сябе шчаслівым чалавекам? Паспрабуйце растлумачыць сэнс выразу *сямейнае шчасце*. Дома прапануйце абмеркаваць гэтае пытанне сваім бацькам.

**Заданне 1 (с. 73).** Настаўнік прапануе выканаць першае заданне ў сшытку для стымулюючых заняткаў:

*Прачытайце сказ, у якім хлопчык расказаў, што ён бачыў у лесе. Чаму ён параўнаў елачку з вожыкам?*

Вучні чытаюць уголас вершаваныя радкі:

Зялёныя вожыкі елак
Паселі навокал дубка. *(П. Прануза.)*

Для найлепшага разумення вобразнасці гэтых вершаваных радкоў вучням мэтазгодна прапанаваць малюнак, на якім побач з невялікім дубком растуць елачкі.

— Растлумачце значэнне слоў *вожык, елка*. Чым вожык і елка падобныя паміж сабой? Як вы разумееце сэнс сказа «Зялёныя вожыкі елак паселі навокал дубка»? Якія словы для апісання елачак прапанавалі б вы? Чаму?

Графічнае маляванне, прапанаванае ў сшытку, на гэтых занятках можна замяніць на слоўнае.

Затым вучням прапануецца выканаць **дадатковае заданне**: з прачытаных раней вершаваных радкоў выпісаць словы з парным зычным у сярэдзіне слова, які трэба правяраць, падабраць да яго праверачнае слова.

Настаўнік прапануе вучням ацаніць правільнасць выканання асноўнага і дадатковага заданняў, палічыць, колькі балаў яны здолелі атрымаць, і пазначыць у рубрыцы «Паслядоўнасць і вынік маёй працы» на с. 77.

— Пра якія цікавы сямейны занятак нагадалі вам гэтыя вершаваныя радкі? (Прыкладны адказ: *сямейныя прагулкі ў лес, парк*.) Якія цікавыя моманты з жыцця прыроды дапамагаюць на прагулках заўважыць вам бацькі?

Па меркаванні настаўніка загадзя можа быць створана мультымедыйная прэзентацыя на аснове фотаздымкаў сямейных прагулак ці падарожжаў вучняў класа. Некалькі вучняў могуць падрыхтаваць невялікае паведамленне пра цікавыя прагулкі ў іх сям'і. Таксама можа быць выкарыстаны ўрывак з верша Івана Муравейкі «Лясная пяшчота»:

У ялін — яліначкі,
Дачушкі-балерыначкі,
У дубоў — дубочкі,
Цудоўныя сыночкі.
Ляцяць-шумяць хвіліначкі,
Ідуць дзянькі, гадочкі —
Спяшаць расці яліначкі,
Не адстаюць дубочкі.
Хістаюцца галіначкі
І шэпчуць днём і ночкай:
— Мы любім вас, яліначкі!
— Мы любім вас, дубочкі!

— Каго нагадалі аўтару вялікія, дарослыя яліны, дубы і маленькія парасткі? Чаму? Як называе маладыя дрэўцы паэт? Як вы разумееце загаловак верша «Лясная пяшчота»?

Выраз ***Сямейныя прагулкі*** можна запісаць на далоньцы, выразанай з каляровай паперы, і размясціць на дошцы ў класе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Заданне 2 (с. 73).** *Прачытайце сказы. Падкрэсліце словы, з дапамогай якіх аўтар апісвае бярозкі.*

*Каля лесу стаяць бярозкі. Яны так падобны на красунь у белых сарафанах з распушчанымі косамі. (У. Шайдаў.)*

— Паспрабуйце растлумачыць значэнне слова *бяроза*. З кім параўноўвае аўтар бярозкі ў сказе? Чаму? Якія вобразныя параўнанні для апісання бярозак можаце прапанаваць вы?

**Дадатковае заданне:** абвядзіце словы з мяккім знакам. Падкрэсліце ў іх зычныя, мяккасць якіх абазначае мяккі знак.

Вучні падводзяць вынікі выканання задання, падлічваюць і запісваюць колькасць балаў.

— Хто з вас любіць маляваць? Які малюнак вы стварылі б да вобразных сказаў пра бярозак. У каго любяць маляваць мамы ці таты? Раскажыце, ці стваралі вы калі-небудзь сумесныя малюнкі.

Настаўнік падводзіць да думкі, што сумеснае маляванне — захапляльная справа для ўсіх членаў сям'і. Мэтазгодна прадэманстраваць некалькі малюнкаў, створаных членамі сям'і вучняў.

На папяровай далоньцы можна зрабіць запіс: ***Маляванне ўсёй сям'ёй***.

Для працы можа таксама быць выкарыстаны верш «Казкі ў небе»:

Над маёю галавою
Неба ў хмарках — як альбом.
Хто герояў дзіўных казак
Там малюе светлым днём?
Вунь ляціць імклівы коннік,
Грыва ўецца ў скакуна.
Вунь паўлін увачавідкі
Перакінуўся ў слана!
Прамільгнуў вярблюд двухгорбы.
А за ім — у ботах кот.
Весяляцца, б'юць у ладкі.
Водзяць гномы карагод.
Ой, такога вы ніколі
Не пабачыце ў жыцці:
Проста з хмаркі пералётнай
Стала яблынька расці.
Хто мастак той, невідзімка?
Хто малюе зноў і зноў
Гэтых казачных герояў,
Птахаў розных і звяроў?
Я з акна альбом нябесны
Разглядаю ў вольны час,
Толькі на сваё пытанне
Не магу знайсці адказ.

*(Рыўка Зіў, пераклад Міколы Маляўкі.)*

У якасці цікавага прыёму, які абуджае творчае ўяўленне і дзяцей і дарослых, для сямейнага малявання настаўнік прапануе апісанне задання «Кляксаграфія»: на аркушы паперы адвольна пастаўленая каляровая клякса дамалёўваецца да зразумелага і вядомага ўсім вобраза (жывёлы, расліны, прадметы адзення, абутку, мэблі і інш.). Затым

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## ЗНАЧЭННЕ СЛОВА

Дата ____________

**1.** Прачытай сказ, у якім хлопчык расказаў, што ён убачыў у лесе. Чаму ён параўнаў елачку з вожыкам?

Зялёныя вожыкі е́лак
Пасе́лі навокал дубка.

*П. Прануза.*

Намалюй, якой ты ўяўляеш сабе карціну, апісаную ў вершы.

(+1) Выпішы словы з парным зычным у сярэдзіне слова, якія трэба правяраць. Падбяры праверачнае слова.

______________________________

**2.** Прачытай сказы. Падкрэслі словы, з дапамогай якіх аўтар апісвае бярозкі.

Каля лесу стаяць бярозкі. Яны так падобны на красунь у белых сарафанах з распушчанымі косамі (*У. Шайдаў*).

(+1) Абвядзі словы з мяккім знакам. Падкрэслі ў іх зычныя, мяккасць якіх абазначае мяккі знак.

**3.** Прачытай верш. Чым ён цябе развесяліў?

З'інелая Ната
Дадому прыйшла.
Ціка́віцца тата:
— І дзе ты была?
Адказвае Ната:
— Ката́лася я.
— Каталася? Дзе?
— Па слі́зкай вадзе.

*А. Зэкаў.*

◊ ***З'інелая*** — тут: *дзяўчынка доўга была на марозе і быццам пакрылася інеем (каўнер, бровы і валасы пабялелі).*

Напішы слова, якое Ната павінна была сказаць замест выразу ***слізкая вада***.

К О К А Т

______________________________

(+1) Адкажы на пытанні поўнымі сказамі.

Якая пара года апісваецца ў вершы? ____________

Дзе была Ната? ____________

На чым каталася дзяўчынка? ____________

бацькі і дзеці адгадваюць, у каго ператварылася клякса.

Настаўнік прапануе выканаць наступнае заданне.

**Заданне 3 (с. 74).** *Прачытайце верш. Чым ён вас развесяліў?*

З'інелая Ната
Дадому прышла.
Цікавіцца тата:
— І дзе ты была?
Адказвае Ната:
— Каталася я.
— Каталася? Дзе?
— Па слізкай вадзе. *(Анатоль Зэкаў.)*

Тлумачыцца значэнне слова *з'інелая* (у дадзеным выпадку слова паведамляе, што дзяўчынка доўга была на марозе і быццам пакрылася інеем: каўнер, бровы і валасы пабялелі).

— Што вы ўявілі сабе, калі пачулі выраз *слізкая вада*, вымаўлены Натай? Чаму? *(Лёд на катку.)*

**Дадатковае заданне:** адкажыце на пытанні верша поўнымі сказамі:

— Якая пара года апісваецца ў вершы?
— Дзе была Ната?
— На чым каталася дзяўчынка?

Вучні падводзяць вынікі выканання задання, падлічваюць і запісваюць колькасць балаў на с. 77.

— Як у вашай сям'і захоўваюцца ўспаміны пра цікавыя здарэнні, незвычайныя дзіцячыя словы і выразы, якія вы ўжывалі, калі былі маленькімі? Пра якія цікавыя заняткі нагадаў верш? (Прыклад адказу: *складанне дзіцячага слоўніка ці энцыклапедыі сямейных успамінаў.*)

Вучні ці іх бацькі паведамляюць некалькі цікавых выпадкаў, якія адбываліся ў іх сем'ях. Можа быць праведзена інсцэніроўка наступных вершаў:

— Падстаў далонькі, — кажуць Жэню,
Табе дадуць арэхаў жменю.
А Жэня паўтарае ўпарта:
— Няхай свае падставіць тата.
— Ты вельмі любіш тату, Жэня?
— Люблю. І большай будзе жменя.
*(Уладзімір Мацвеенка.)*

**Дзе прывітанне?**

Доўга татка гасцяваў.
І сыночак Ваня,
што татульку прычакаў,
кажа з хваляваннем:
— Што мне, татачка, прынёс?
— Толькі прывітанне.
— Прывітанне? Дзе яно?
Я чакаю — дай мне! *(Васіль Жуковіч.)*

На папяровай далоньцы робіцца запіс: ***Слоўнік сямейных успамінаў.***

**Заданне 4 (с. 75).** Настаўнік прапануе разгледзець малюнкі і выканаць заданні:

✓ У слове *шыпшына* адшукайце і запішыце назву кола машыны і калючкі расліны. *(Шып і шына.)*

✓ У слове *экскаватар* знайдзі назвы напітку і валакністага матэрыялу, які выкарыстоўваецца ў медыцыне. *(Кава і вата.)*

✓ У слове *каралеўна* схавалася марская жывёла, якая жыве нерухомымі калоніямі на скалах, і драпежны звер. *(Карал і леў.) (Паводле Міхася Пазнякова.)*

Пад кіраўніцтвам настаўніка тлумачыцца значэнне кожнага адгаданага слова.

**Дадатковае заданне:** з ліку знойдзеных слоў выпішыце тыя, у якіх два склады. Пазначце лічбамі колькасць галосных і зычных гукаў у гэтых словах.

Вучні падводзяць вынікі выканання задання, падлічваюць і запісваюць колькасць балаў.

— Каму з вас спадабалася гуляць са словамі? Пра якія цікавыя заняткі для сямейнага адпачынку вы ўспомнілі пасля выканання заданняў. (Прыкладны адказ: *разгадванне загадак, крыжаванак, галаваломак усёй сям'ёй.*)

Вучням прапануецца адказаць на пытанні верша «Пытанні на змярканні»:

Юлін тата на змярканні
Дзеткам задаваў пытанні.
На пытанні тыя вас
Папрашу я даць адказ.
Бульбу садзяць па вясне —
Так ці не?
Кніжку носяць на спіне —
Так ці не?
Рыбка скача па сасне —
Так ці не?
Вецер долу дрэўцы гне —
Так ці не?

**4.** У слове ***шыпшы́на*** адшукай і запішы назвы кола машыны і калючкі расліны.




У слове ***экскава́тар*** знайдзі назвы напітку і валакністага матэрыялу, які выкарыстоўваецца ў медыцыне.





У слове ***каралеўна*** схавалася марская жывёла, якая жыве нерухомымі калоніямі на скалах, і драпежны звер (*Паводле М. Пазнякова*).




З ліку знойдзеных слоў выпішы тыя, у якіх два склады. Пазнач лічбамі колькасць галосных і зычных гукаў у гэтых словах. +1

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

Зубы месяцца ў дзясне —
Так ці не?
Караблям свяціў маяк —
Не ці так?
Рыбы налавіў рыбак —
Не ці так?
Спіць на хмарцы Шапакляк —
Не ці так?
Ехаў на кані казак —
Не ці так?
Боцікі абуў хамяк —
Не ці так?
На карме стаяў марак —
Не ці так?
Бегемот залез у гляк —
Не ці так? *(Уладзімір Мацвеенка).*

На каляровай далоньцы запісваецца: ***Адгадванне загадак і іншыя гульні са словамі.***

**Заданне 5 (с. 76).** *Адгадайце загадкі. Вусна растлумачце значэнне слоў «гадзіннік», «будзільнік». Намалюйце адгадкі.*

І дзень ішоў, і ноч ішоў,
А з месца нават не сышоў.
Хістае дзюбай і хвастом —
Будзільнік ходзіць пад акном.

**Дадатковае заданне:** выпішыце словы з літарай ***ў*** нескладовае. Падзяліце іх для пераносу.

Вучні падводзяць вынікі выканання задання, падлічваюць і запісваюць колькасць балаў.

— Якія цікавыя сумесныя заняткі дапамагаюць вам больш даведацца пра навакольны свет? (Прыклад адказу: *чытанне кніг разам з бацькамі, узбагачэнне слоўнікавага запасу.*) Для абмеркавання галоўнай думкі вучням прапануецца ўрывак з верша:

Я чытаю казкі-дзівы,
У людзей вучуся добрых
Быць сумленным і праўдзівым,
Працавітым, мужным, шчодрым. *(Э. Агняцвет.)*

На папяровай далоньцы робіцца запіс: ***Хвілінкі сямейнага чытання.***

***Заданне 6 (с. 76).*** *Да кожнага слова з левага слупка падбярыце словы з правага, блізкае па значэнні, і злучыце іх:*

*абрус* — *вандроўнік*
*дарога* — *настольнік*
*падарожнік* — *шлях*

Значэнне кожнага слова коратка тлумачыцца.

**Дадатковае заданне:** з адным са слоў складзіце і запішыце сказ.

Вучні падводзяць вынікі выканання задання, падлічваюць і запісваюць колькасць балаў.

— Пра якія карысныя заняткі дапамаглі вам здагадацца словы з гэтага задання? (Прыклад адказу: *словы «абрус», «настольнік» нагадалі пра гасціннасць, працу па гаспадарцы.*)

Загадзя падрыхтаваныя вучні інсцэніруюць жарт «Дапамагала маме...». Дзеючыя асобы: аўтар, дзяўчынка Марылька і яе бабуля.

**Аўтар.** Марылька хваліцца бабулі:

**Марылька.** Мама шыла мне спаднічку. А я ёй дапамагала.

**Бабуля.** Як жа ты ёй дапамагала, унучка?

**Марылька.** Ціха сядзела і цукеркі смактала. (Паводле В. Лаўрыновіча.)

На папяровай далоньцы з'яўляецца запіс: ***Дружная праца па гаспадарцы.*** Далонька таксама размяшчаецца на дошцы. Настаўнік прапануе вучням хорам прачытаць, пра якія цікавыя і карысныя сямейныя заняткі яны ўзгадалі:

– сямейныя прагулкі;
– маляванне ўсёй сям'ёй;
– слоўнік сямейных успамінаў;
– адгадванне загадак і іншыя гульні са словамі;
– хвілінкі сямейнага чытання;
– дружная праца па гаспадарцы.

Вучні разглядваюць малюнак на с. 77. Пад кіраўніцтвам настаўніка складаюць невялікае апавяданне, як мама, тата і дачушка гулялі ў шашкі. Затым згодна з умоўнымі абазначэннямі малюнак расфарбоўваецца. Настаўнік правярае правільнасць выканання заданняў, звяртае ўвагу на аб'ектыўнасць самаацэнкі сваёй працы вучнямі.

Гучыць лірычная мелодыя. Настаўнік прапануе ўспомніць, якое свята адзначаецца 15 мая, яшчэ раз звяртаецца да выставы «Святло маёй сям'і». Праводзіцца «Марафон прыказак і прымавак пра сям'ю».

Прыкладны матэрыял:

- Нашто клад, калі ў сям'і лад.
- Бацькоўскае слова дарэмна не гаворыцца.

**5.** Адгадай загадкі. Вусна растлумач значэнне слоў ***гадзіннік***, ***будзільнік***. Намалюй адгадкі.

І дзень ішоў, і ноч ішоў,
А з месца нават не сышоў.

Хістáе дзю́бай і хвастом —
Будзільнік ходзіць пад акном.

**+1** Выпішы словы з літарай ***ў*** (***у*** нескладовае). Падзялі іх для пераносу.

**6.** Да кожнага слова з левага слупка падбяры словы з правага, блізкае па значэнні, і злучы іх.

абрус — вандроўнік
дарога — настольнік
падарожнік — шлях

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

➢ Бацька і маці на рабоце не то́мяцца, калі з дзетак сваіх цешацца.
➢ Бацькоў слухаць — гора не знаць.
➢ Добрае дзіця бацькоў думкі адгадвае.
➢ Благая тая птушка, што свайго гнязда не пільнуецца.
➢ Бацькоў любі, старэйшых паважай.
➢ Паважай старэйшых, бо сам стары будзеш.
➢ Дзе стары варчыць — малады памаўчыць.
➢ Падсадзі на печ дзядулю — цябе ўнукі падсадзяць.

Настаўнік яшчэ раз звяртаецца да тлумачэння значэння слова *сям'я*. Затым кожны вучань класа атрымлівае маляўніча аформлены аркуш паперы, прымацаваны да паветранага шарыка. На аркушы змешчаны спіс цікавых сямейных заняткаў, які кожная сям'я можа пашырыць. Напрыклад:

- Плесці вянкі з дзьмухаўцоў.
- Слухаць спевы птушак.
- Пускаць сонечных зайчыкаў.
- Назіраць, як прарастае насенне.
- Любавацца зорным небам.
- Выразаць гірлянду папяровых чалавечкаў.
- Рабіць папяровыя караблікі.
- Будаваць з галінак шалаш.
- Пускаць мыльныя бурбалкі.
- Пакідаць адбіткі слядоў на снезе.
- Майстраваць кармушку і карміць птушак.
- Разам складаць вершы, апавяданні ці казкі.

З адным са слоў складзі і запішы сказ.

+1

______________________________

______________________________

**Паслядоўнасць і вынік маёй працы:**



№

№

№

№

№

№

***Умоўныя абазначэнні:*** *і* — белы, *дз* — чырвоны, *дж* — зялёны, *'* — сіні, *ў* — чорны.

- Фантазіраваць, на каго падобныя воблакі.
- Прыдумваць казачных герояў з прыроднага матэрыялу.
- Будаваць замкі з пяску.
- Разам гатаваць сняданак ці вячэру.
- Спяваць хорам цудоўныя песні.
- Дзяліцца марамі і моцна любіць сваю сям'ю.

***І. А. Буторына,*** *метадыст вышэйшай катэгорыі аддзела метадычнага забеспячэння пачатковай адукацыі НІА*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ